

Янка Купала


ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА
ПРЫ СНК БССР

Янка Купала

ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ





ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА пры СНК БССР
РЭДАКЦЫЯ ДЗІЦЯЧАЙ ЛІТАРАТУРЫ
МІНСК—1940



ГОРАД ШЧАСЛІВЫ...

Горад шчаслівы, шчаслівыя сёлы,
Льюцца крыніцы з вясновых прагалін.
Шчыра, ад сэрца, з усмешкай вясёлай
Волю і шчасце гадуе нам Сталін.



МАЯ РАДЗІМА

Чуй, народ совецкі,
Чуй, мая радзіма!
Сваёй долі, волі,
Чуй, не аддадзім мы!

Будзеш векі жыці,
Зямелька Советаў,
На радасць, на шчасце
Працоўнаму свету.

Засяваць мы самі
Будзем нашы нівы,
Збіраць самі будзем
Ураджай шчаслівы.

Хай пад сонцам знаюць
Чым мы сёння сталі!..
Мы падставім грудзі
За цябе, наш Сталін!



НАШАМУ СВЯТУ

Расчыні шырока дзверы,
Мілая старонка,
Выйдзі стрэнуць свой Кастрычнік
Песняй гулкай, звонкай!

Свята нашай гадавіны,
Хоць і ўвосень свята,
Свеціць вечнаю вясною
Нашым нівам, хатам.

Мы ідзем сабе пад сонцам
Маладым паходам.
Слава бацькаўшчыне нашай
І яе народам!



СЫНЫ

Сыноў бацька сваіх кліча
 На нараду ў хату,
А ўрачыста, як-бы кліча
 На якое свята.

І з павагаю пытае
 Кожнага ў асобку,
Кім з іх кожны быці хоча,
 Якім жыць заробкам.

—Бо, сыны мае,—так кажа,—
 Жывіцё ў краіне,
Чалавечая дзе праца
 На марна не гіне.

І сыны адказ трымалі
Перад бацькам родным,
А стараўся з іх быць кожны
Свайго бацькі годным.

Першы кажа:—Землі буду
Трактарам варочаць,
Каб рунелі, зелянелі,
Аж яснелі вочы.

Каб раслі ў рост чалавека
Жыта і пшаніца,
Каб аж госці к нам з-за свету
Ехалі дзівіцца.

Другі кажа:—На заводзе
Быць хачу даўно я,
Дзе чыгун ракою льецца,
Дзе звініць сталь звонам.

Будаваць буду дзень цэлы
Домны і мартэны,
Медзь і вугаль браць у дзела
Ад шахтаў падземных.

—Плаваць я пайду на мора,—
Сказаў гэтак трэці,—
Дзе „Чэлюскін“ горда плаваў,
Дзе пурга, дзе вецер.

Ад халодных да гарачых
Мораў рэйс мой будзе,
Параход мой будзе грозна
Рэзаць хваляў грудзі.

Сын чацверты:—Хачу лётаць
Птушкаю крылатай,
Мерацъ неба ў самалёце
Над тваёю хатай.

Арлянём сябе ў сне бачу,
Не знаю спакою...
Хачу быць я, мой ты бацька,
Лётчыкам-героем!

—Байцом буду я чырвоным,—
Пяты кажа гэтак,—
Сцерагчы граніцы-межы
Краіны Советаў.

Каб наш вораг пры нападзе
Сустрэнуў магілу.
Байцом буду, каб з мяне быў
Рад сам Варашылаў.

А сын шосты:—Складаць песні
Буду, колькі змогі,
Пра вялікія падзеі
Сталінскай эпохі.

Як працуем, як знішчаем
    Здрадныя напасці,
Як будуем, як ствараем
    Ка́зачнае шчасце.

Так сыны адказ трымалі
    З гонарам юначым,
Свае выказаці думкі
    Не ўмелі іначай.

Большэвік быў іхні бацька,
    Пролетарый родам,
Зведаў сушы, зведаў моры,
    Бітвы і паходы.





ВЫПРАЎЛЯЛА МАЦІ СЫНА...

Выпраўляла маці сына
З калгаснае хаты
Не на службу у чужыну,
Не к дзяўчыне ў сваты.

Выпраўляла і казала:
— Мой сыночак мілы,
Ужо маеш ты нямала
Розуму і сілы.

Пойдзеш ты у свет і людзі
Хадою адважнай,
Прад табою слацца будзе
Край наш неабсяжны.

Не зазнаеш крутых сцежак—
Сыты і адзеты—
Вартаваць ты будзеш межы
Краіны Советаў.

Не зазнаеш тамка гора,—
Будуць паважаці,
Даглядаць цябе не горай,
Як родная маці.

Не ў салдатах быць пад царам,
Пад кнутом жандарскім,—
Служыць будзеш ты Советам,
Справе пролетарскай.

Выпраўляла маці сына
З калгасных загонаў,
Каб служыў той верна, чынна
Арміі Чырвонай.





ХЛОПЧЫК І ЛЁТЧЫК

— Мой мілы таварыш, мой лётчык,
Вазьмі ты з сабою мяне!
Я—ведай—вялікі ўжо хлопчык,
І ўмею ўжо лётаць у сне.

Мне мама сягоння казала,
Што стукнула мне ўжо сем год,
Табе гэта, можа, і мала,
А мне ляцець толькі ў палёт.

Мне ўжо надакучыла дома—
Ў дзіцячы хадзі адно сад,
А так паглядзеў-бы, вядома,
На іншы парадак і лад.


Вазьмі-ж мяне, лётчык, хачу я
Пабыць у людзях, паглядзець,
Як месяц на небе начуе,
Як блукае ў лесе мядзведзь.

Як свецяцца ночкаю зоры,
А днём не відаць іх чаму,
Як рэчкі ў далёкія моры
Улетку плывуць і ўзіму.

На моры зірнуць хоць раз вокам,
Як ходзяць па іх караблі,
Ляцеці далёка, высока
Ды так пабываць і ў Крэмлі.

І там з-пад нябеснае далі
Грымнуць громка усімі грудзьмі:
— Дзень добры, таварыш наш Сталін!
Паклон з самалёта прымі!

Вось гэтак у добрым здароўі
Мы будзем ляцець і ляцець.
Вазьмі-ж мяне, лётчык, з сабою,
Не будзеш ты клопату мець!



НАШ ПАЛКАВОДЗЕЦ


Раскажу я маме мілай
Які ў нас быў дзень адменны:
Сам таварыш Варашылаў
Прынімаў парад ваенны.

Не высокі сабе ростам,
Не высокі і не нізкі,
І такі вясёлы, просты,
Такі родны, такі блізкі!

Конь пад ім, прост, вярнігора!
А як скача, як гарцуе.
Ён вачыма лічыць зоры,
Ён вушамі вайну чуе.

Вайну чуе, броў не хмура,
Толькі бліскаюць падкоўкі,
Бо яздок на ім што бура,
З віхрам пойдзе ў перагонкі!

У міжбур'е з ім жыць міла,
Лёгка-ж будзе і ў паходзе.
Во, які наш Варашылаў!
Во, які наш палкаводзец!



ПАРАД

Во спачатку йдзе пяхота,
За ёй конніца і танкі,
На машынах едуць роты,
А там—быстрыя тачанкі.

За тачанкамі—гарматы
Палявыя і мартыры,
А пад небам—рой крылаты,—
Самалётаў цэлы вырай.

Як зірнеш, дык ажно люба!
Галава аж ходам ходзіць!
Во дзе ворагу загуба,
Калі ўздумае нам шкодзіць!



АЛЕСЯ

Кукавала зязюля
У зялёным лесе,
Гадавала матуля
Дачушку Алесю.

Гаманіў бор сасновы
Ўвечары і ранкі,
Над калыскаю ліповай
Пела калыханкі.

— Спі, засні, мая дзетка,
Птушкі ўжо заснулі!
Спі, засні, мая кветка,
Люлі, люлі, люлі!

Спі, не ведай трывогі!
Надыйдзе часінка,—
На свае устанеш ногі,
Мая ты дзяўчынка.

Будзеш кужаль ты прасці,
Будзеш ткаці кросны,
Выглядаці долі, шчасця
Ў маладыя вёсны.

Кукавала зязюля
У зялёным лесе,
Не згадала матуля,
Што выйдзе з Алесі.

Як набралася моцы
Матчына дачушка,
Паляцела да сонца
Пералётнай птушкай.

Паляцела дзяўчына
Самалётам гонкім
Над шчаслівай краінай,
Над роднай старонкай.

Адчыняе вароты
Нябесным маршрутам,
Ці як ястраб з высотаў
Скача з парашутам.

І да сонца праз хвілю,
А ўсё вышай, вышай!
Самалётавым крыллем
Воблакі калыша.

Стара маці днём, ночкай
Марыць ля аконца:
Ужо к прасніцы дочка
Не зляціць з-пад сонца.

Кукавала зязюля
У зялёным лесе,
Не згадала матуля,
Што выйдзе з Алесі.



ВЫБАРЫ

Запыталіся ў Галінкі,
У малой дзяўчынкі:
— Што сядзіш ты, Галя, ў хаце
І не йдзеш гуляці?

— Пайшлі ў госці мама, тата,
Голас свой панеслі,
Ну, а я пільную хаты,
Сяджу сабе ў крэсле.

Мяне ўзяць з сабой прасіла,
Але ўзяць не ўзялі,
Адно, кажа мамка міла:
Ты йшчэ сходзіш, Галя.

Во, глядзі сама ў ваконца,
Гуляючы дома:
Свой за Сталіна, за сонца,
Голас панясём мы.

Ды йшчэ кажа, што малая,
Урны не дастану...
Што-ж такое?—пачакаю,
Покуль большай стану.



Пройдзе зімка, пройдзе лета,
Як сказаці слова,
Дачакаюся я гэтак
І выбараў новых.

Будуць рады татка, мама,
Калі падрасту я,
І за Сталіна таксама
Я прагаласую.

І ў Галінкі-дзіцяняткі
Ад такой гаворкі
Ажно йскрацца вачаняткі,
Нібы ў небе зоркі.

— Куды йдзеш ты, мая бабка?—
Кажа ўнук бабулі,—
То сядзіць, не злазіць з печкі,
Цяпер во, на гулі!

Сама ведае, што хвора,
Што баляць ёй грудзі.
Аддыхала-б лепей дома,
Чымся пхнуцца ў людзі.

І бубніць, бубніць бабульцы
Ўнук сямігадовы,
А бабуля яму кажа,
Падбірае словы:

— Што ты ведаеш, Данілка?
Лепш пабудзь во ў хаце,
То-ж на выбары іду я
Голас свой падаці.

Сабе ўжо і дэпутата
Выбрала адразу:
Варашылаву свой голас
Аддам з сэрцам разам.

— Варашылаву? Я знаю,
Сам я з ім вітаўся.
Ён, калі былі манеўры,
Ў нашым быў калгасе.

Ну, за гэтага дык можна—
Чалавек вядомы!
Галасуй ідзі, бабулька,
Я пабуду дома.

Варашылава я так-жа
Выберу з часамі,
На сямі канях паеду
З сямю галасамі!

Сеў Данілка, выразае
Коніка з бярозкі,
Адно бліскаюць у вочках
Радасныя слёзкі.



ДАРОГІ

Дарогі вы шасейныя,
Шчаслівыя дарогі,
Істужкамі пасlaліся
На нашыя разлогі.

Праз поле ураджайнае,
Тарфяныя балоты,
Праз пушчы векавечныя
Ляглі вы пазалотай.

Ніколі вы не дрэмлеце:
Ад ранка і да ранка
Па вас машына коціцца
І конная фурманка.

І пешаходам весела—
Малодшы ён ці старшы;
Байцы Чырвонай Арміі
Ідуць паходным маршам.

Грузавікі з таварамі
Бягуць ва ўсе староны,
З лістамі віншавальнымі
Шнуруюць паштальёны.

Злучылі з гулкім горадам
Спакойныя разлогі,
Дарогі вы шасейныя,
Шчаслівыя дарогі.

З бяспуцця непраходнага,
З калдобін-катлавінаў
Ты вышла, ордэнаносная,
На роўны шлях, краіна!



ПОЛЕ

Люблю цябе, поле,
Вясёлай вясною,
Як ты заруністся
Ўсякай збажыною.

Люблю цябе летам,
Як красуе ніва,
Як шуміць ад ветру
Радасна, шчасліва.

Люблю цябе, поле,
Восенню прыгожай,
Як напоўніш пуню
Умалотным збожжам.

Люблю тады нават
Цябе, маё поле,
Як над табою жудка
Зімка заскаголе.

Поле маё, поле,
Як-жа ты мне міла!
Як люблю цябе я
З усёй моцы, сілы!



ВЯСНА

У вянку з пралесак,
У зялёнай шаце
Ходзе борам-лесам,
Полем, сенажацяй.

Сонцу-яснагрэю
Расплятае косы,
Раніцамі сее,
Як брыльянты, росы.

Сцелецца травіцай,
Ветрыкам шапоча,
Коціцца крыніцай,
Рыбкаю плюскоча.

У гайкі заходзе,
Шапаціць лісткамі,
Гутарку заводзе
З белкамі, з дзятламі.

І усюды гэтак—
Полем, сенажацяй—
У вяночку з кветак,
У зялёнай шаце.






МАЙ

Да нас у госці май прыходзіць,
Як не прыходзіў у вяках,
Спявае песні аб свабодзе
На полі, ў моры, ў рудніках.

Спявае дзецям калыханкі,
Прыгожыць кветкамі сады,
Вядзе сялянаў і сялянкаў
На шлях шчаслівы, малады.

Прыходзіць май зялёны ў госці,
А з падарункамі ідзе,
Уцеху буйнай сыпе горсцю
Святочна ўбранай грамадзе.



НА НАШЫМ ПОЛІ...

На нашым полі,
Полі калгасным,
Дзянькі праходзяць
Весела, ясна.

Дружна працуем
Мы грамадою,
Знацца не знаем
З горам, з бядою.

Пры нашым ладзе,
Пры калектыўным,
Рукам падмогай
Служаць машыны.

Болей не знаем
Сох на загонах,—
Трактар нам цягне
Плугі, бароны.

Сонейка ўзыйдзе,
Сонейка зайдзе,
Сеем і полем
Шчыра, папраўдзе.

Сеем, збіраем
Спелае збожжа,
Сабе, краіне
Багацце множым.



Я—КАЛГАСНІЦА...

Я—калгасніца
Маладая,
Жыву весела,
Ані дбаю.

Мае дзетачкі
Позна-рана
І накормлены,
І прыбраны.

Сваю Настачку—
Дзіцё тое—
Нясу ў яслі я
Раніцою.


А Данілачка,
Важным хлопцам,
Рады бегае
На пляцоўцы.

А як выйду я—
Іхня маці—
Ды калгаснае
Жыта жаці,—

Густа сцелюцца
Ўслед снапочкі.
Пяю песенькі
Аж да ночкі.

Супакойна я
Ўжо за дзетак,
Сваіх роднenькіх
Малалетак.

Я—калгасніца
Маладая,
Жыву весела,
Ані дбаю.



ЯК Я МОЛАДА БЫЛА...

Як я молада была,
Гаравала многа...
Ад сяла і да сяла
Блукала знямога.

Нехапала той зямлі,
Нехапала ежы;
Ні той скваркі хоць калі,
Ні цэлай адзежы.

Бацька гоніць на начлег,
Маці ў двор да пана;
Ні вясёласці, ні ўцех
Ад долі паганай.

А сягоння, во, мае
І дзеці і ўнукі—
Кожны ўдоваль есць і п'е,
Не ведаюць мукі.

Ці Кастрычнік, ці то Май,—
Гонару набралі,—
Ім ядваб* ужо давай,
Не хочуць паркалю.

Патэфоны граюць ім,
Радыё іграе;
Не было ў жыцці маім
Гэтакага раю.

Як я молада была,
Бедавала многа...
Ад сяла і да сяла
Блукала знямога.

---

* Ядваб—шоўк.



РЭЧКА

Між гор, далінаю, за вёску,
Не аглядаючыся, ўзвыш,
Суважна, папрасту, па-свойску
Бяжыш ты, рэчка, і бяжыш.

Падгоніш каменьчык жвіровы,
Травінку водную трасеш,
Чапаеш карэньчык альховы,
Паверху кветачку нясеш.

І лёд зімой табе не шкодзе—
Ўсё коцішся, а цёплым днём
На бераг выглянеш разводдзем,
Дый потым—зноў сваім слядком.



ДЗІКАЯ ГРУША

Калышыцца сталетняя,
Шуміць на ўсе староны,
На ёй галінаў тысячы,
Лісткоў на ёй мільёны.

Шпакі на ёй чырыкаюць,
Ваверкі часта скачуць,
І сонца дорыць спёкамі,
І хмары дажджом плачуць.

Яна, загартаваная
Сталетняю парою,
Шуміць, заходзе ў гутарку
То з небам, то з зямлёю.

ДУБ

Распусціўшы веццe
У глухім прыволлі,
Сам адзін расце ён
На далёкім полі.

Думны, кучаравы,
Аб нічым не дбае,
Ці-то стогне бура,
Ці віхор гуляе.

На адным ён месцы
Днюе і начуе,
Многа казак знае,
Многа песень чуе.

Дождж падмыў
карэнне,
Ў ім дупло, як хата...
Ён стаіць і дрэмле,—
Грозны, расахаты.

СОСНЫ

Сосны выносныя,
Гордыя сосны!
Шмат вы ўжо носіце
Сонечных вёснаў.

Вас, супакойныя,
Вецер калыша,
Думкі ўзнімаеце
Шумам і цішай.



Тыя-ж на поўначы—
З вёснаў да вёснаў—
Ў сцюжнай Карэліі
Высяцца сосны.

Тыя-ж на поўдзені,
Над цёплым морам,
Сосны ахуталі
Крымскія горы.

*

Сосны далёкія,
Блізкія сосны!
Сэрцу вы любыя
З вёснаў да вёснаў.

Вас адзінакава
Вецер калыша,
Думкі ўзнімаеце
Шумам і цішай.

ЛЕТАМ

Звоніць поле доляй, воляй,
Звоніць поле ў каласкі.
Ў буйным лузе ззяюць, граюць
Кветкі, мошкі, матылькі.

Рэчка ўецца і смяецца
Да зялёных лоз і вольх,
А ў вадзіцы шыбка рыбка
Мігаціць на паплаўкох.

Лес адвечны, бесканечны
Цягне-цягне гоман свой.
Між хвой скачуць птушкі-ўюшкі
І пяюць, пяюць гурмой.







ЛЕТНЯЯ РАСА

Як брыльянты, рассявае
Ночка летнюю расіцу,
Туманамі спавівае
Луг зялёны над крыніцай.

А як раніца настане,
Бліскі сонца загуляюць,
Бо прыходзіць адцвітанне,
Туманы у рэчцы таюць.

Як брыльянты, гінуць росы
На зялёнай сенажаці.
Сонца косы, нашы косы
Не даюць паўдня ім знаці.



ОСЕНЬ

З буйных ліп і бяроз
Лісты валяцца,
Між павалаў і лоз
Рассыпаюцца.

Шапацяць, шалясцяць
Залацістыя,
Веткі ў неба глядзяць
Пусталістыя.

Як-жа прыдзе вясна,—
Ўсё адменіцца,
І галінкі ізноў
Зазяленяцца.



НОВАЯ ВОСЕНЬ

Па-новаму восень палеткі
Абходзіць, глядзіць гаспадаркі...
Пайшлі аддыхаць пад паветкі,
Згуляўшы дажынкі, жніваркі.

У вырай сабраліся гусі,
І жораў азваўся пад небам...
Плывуць па шляхах Беларусі
Абозы чырвоныя з хлебам.

Асенняе сонца спакойна
Ў прасторах нямых пахаджае...
Гуляе пад сцягам чырвоным
Калгаснае свята ўраджаю.

ЗІМА

Было цёпла. У ваконца
Заглядала ясна сонца.
Аж, ні села і ні пала,
Зіма з снегам загуляла.

Усю нашую старонку
Спавіла як у пялёнку.
Няма траўкі, няма кветак,
Пуста гэтак, глуха гэтак.

Сціхла рэчка, як забіта,
Пад шкляною лёду плітай;
Лес пашумам не гамоніць,
Птушак песнямі не звоніць.



ЗІМОЙ У ЛЕСЕ

І лягла цішыня
У бары за гарой,—
Каб дравінка адна
Хоць кіўнула сабой.

Снег пушаны залёг
На галінах сасон,
І чарнобыль, і мох
Атуліў сабой ён.

Сокат птушак замёр,
Як-бы поўнач была,
Адно свісне тапор,
Ды зазвоніць піла.

Далей—глуш, цішыня
У бары за гарой,—
Каб дравінка адна
Хоць кіўнула сабой.





МАРОЗ

Іду я, сняжысты, ўсясільны,
Па сцежках-пуцінах пустых,
І ночкай і днём безупынна
Пільную абшараў сваіх.

Палац мой—лес буйны, вяцвісты—
Ірдзіцца брыльянтамі скрозь,
Мне воўк і мядзведзь у паслугах,
Мне служыць ваверка і лось.

Як пухам, сняжком пасыпаю
І хвою, і ёлку, і клён;
Хто ў госці ка мне забярэцца,
Тулю тых, галублю іх сон.



ЛЯВОНІХА

Ой, Лявоніха, гулянка, гульня!
Галасістая бяседа твая.
А мы, дзеткі, усе здольненькія,
Пяём песенькі вясёленькія.

Як маленькай я ў матулькі жыла,
Як вішанька у садочку цвіла;
Цвіла, цвіла ды пацвітывала,
Лемантарык свой пачытывала.

Як прышла я у дзіцячы садок,
Пайшла з дзеткамі ў танок, у танок;
Я гуляю тут, пагуліваю
За работкай недакучліваю.

Як вішанька у садочку цвіту
І навукі ўсе лаўлю наляту.
Я рысую і пачытываю,
Раблю цацкі самавітыя.



ЮРАЧКА

1

Ой ты, Юрачка,
Што не вучышся?
Так да невукаў
Ты далучышся.

А як вырасцеш
Ты няўмекаю,
Усе высмеюць
Недарэкаю.

А ў нашага Юрачкі
З'елі сала шчурачкі,
Як пабег ён у лясок,
Каб схавацца ад кніжок.

А ў нашага Юрачкі
У капоце дзюрачкі,
Нарабіў ён іх сабе,
Як стаў лазіць па вярбе.

2

Ой ты, Юрачка,
Што лянуешся,
Хаткі нашае
Не пільнуешся?

Толькі бегаеш,
Забаўляешся,
Гэтак з кпінамі
Напаткаешся.

*

А ў нашага Юрачкі
Пагублены гузічкі,—
Ён тады іх пагубляў,
Як з садочку уцякаў.

А з нашага Юрачкі
Сталі кпіць і курачкі,
Што не мыўся цэлы дзень
І бубніць, як авадзень.

3

Ой ты, Юрачка,
Кінь ляніціся
Ды надумайся
Ты вучыціся.


Будзем цешыцца,
Што ты вучышся,
І да невукаў
Не далучышся.

*

А нашаму Юрачку
Кот зрабіў пячурачку,—
Юрка месца там заняў
І з катком—курняў! курняў!

А нашаму Юрачку
Ткнуў камар у скурачку,
А Юрачка—ай-ай-ай!
Камарочак, не кусай!





БАЙ

Бегаў бай па сцяне
У чырвоным кафтане.
Байку баіў. Ай, лю-лі!
Жылі пчолкі у вуллі...
  Баіць ці не?
  — Баіць!

Бегаў бай па сцяне...
Шла вясна па вясне,
Жылі пчолкі з года ў год,
Бралі ў соты з кветак мёд...
  Баіць ці не?
  — Баіць!

Бегаў бай па сцяне...
Ніхто пчолак не кране;

Самі мёд збіраюць той,
Самі ласваюць зімой.
  Баіць ці не?
  — Баіць!

Бегаў бай па сцяне...
У той самай старане
Пустапасам труцень жыў,
Неяк з пчолкамі здружыў...
  Баіць ці не?
  — Баіць!

Бегаў бай па сцяне...
Труцень кажа: „Дайце мне
Глянуць, пчолкі, у вуллёк...
Паспытаці ваш мядок!.."
  Баіць ці не?
  — Баіць!

Бегаў бай па сцяне...
Ці так добра, ці так не,—
Пчолкі добрымі былі,
Трутня ў госці прынялі...
  Баіць ці не?
  — Баіць!

Бегаў бай па сцяне...
Труцень пальцам не кіўне;
Пчолкі мёд нясуць да сот,
Труцень есць ды есць той мёд.
  Баіць ці не?
  — Не!

ЗМЕСТ

Горад шчаслівы 3
Мая радзіма 4
Нашаму святу 5
Сыны 6
Выпраўляла маці сына 10
Хлопчык і лётчык 12
Наш палкаводзец 15
Парад 16
Алеся 17
Выбары 20
Дарогі 24
Поле 26
Вясна 27
Май 29
На нашым полі 30
Я—калгасніца 32
Як я молада была 34
Рэчка 36
Дзікая груша 37
Дуб 38
Сосны 39
Летам 41
Летняя раса 42
Восень 43
Новая восень 44
Зіма 45
Зімой у лесе 46
Мароз 48
Лявоніха 49
Юрачка 51
Бай 54



Рэдактар *Н. Гоџцаў*. Вокладка і тытул мастака *В. Ціхановіча*. Мастацкі рэдактар *Ф. Кругляпскі*. Тэхрэдактар *І. Белкін*. Карэктар *Н. Смольская*. Здана ў друк. 19/XI—39 г. Падпісана да друку 29/II—40 г. Аб'ём 1¾ друк. арк. Папера 70×108 1/32. Знакаў у друкаваным арк. 28.600. Тыраж 7.000 экз. Заказ № 1243. Уп. Галоўліта БССР № А—2645. Друкарня імя Сталіна. Мінск, Дом Друку.

ЦАНА 1 РУБ.

